ло 1255. Отряды в свою очередь делились на взводы и роты. С апреля 1942 г. многие отряды стали объединяться в партизанские бригады, которые могли самостоятельно решать боевые задачи и были наиболее удобной формой организации сил партизан. Как правило, в бригаду входило по 3–7, а иногда до 10 отрядов. Численность бойцов в бригаде варьировалась от 600–800 до нескольких тысяч бойцов.

## КАМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ПАДПОЛЛЕ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941–1944 гг.)

*С. В. Зенчанка*

Ніводная краіна свету не ведае такога шырокага вызваленчага руху, які разгарнуўся падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.

Нягледзячы на тое, што зараз існуюць розныя падыходы да праблемы гісторыі вызваленчага руху на Беларусі, ролю партыйных і камсамольскіх органаў цяжка пераацаніць.

Моладзь заўсёды была самай актыўнай часткай грамадства, не выключэнне і яе ўдзел у Другой Сусветнай вайне. Камсамольска-маладзёжнае падполле Беларусі ўнесла значны ўклад у справу перамогі над фашысцкай Германіяй. Беларуская моладзь мужна змагалася ў партызанскіх атрадах і падполлі.

Ужо напярэдадні акупацыі партыйна-савецкія ўлады паклапаціліся аб тым, каб пакінуць заканспіраваныя групы, арганізаваць яўкі, распрацаваць розныя віды сувязі. Кіраўніцтва камсамола рэспублікі пакінула ў Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай і Палескай абласцях 73 кіруючых работніка, больш за 1400 ячэек, у якіх у агульнай колькасці налічвалася звыш 5 тыс. чалавек [1, с. 292]. Па задумцы партызанскага і камсамольскага кіраўніцтва пакінутым у тыле ворага камсамольцам належала быць тым палітычным ядром, вакол якога павінна была згуртавацца свядомая, патрыятычная моладзь.

Падполле павінна было каардынаваць дзейнасць партызанскіх атрадаў, збіраць звесткі аб ворагу для Чырвонай Арміі, ствараць невыносныя для акупантаў і іх памагатых умовы, паўсюдна распальваць агонь народнай барацьбы супраць прышэльцаў.

Камсамольцы-падпольшчыкі ўдзельнічалі ў партызанскіх рэйдах, праводзілі дыверсійна-баявыя аперацыі ў гарадах.

На пачатку вайны камсамольска-маладзёжнае падполле сутыкнулася са шматлікімі цяжкасцямі. Напрыклад, у ноч з 13 на 14 жніўня 1941 г. фашысцкая авіяцыя разбамбіла многія раёны Гомеля, асабліва яго цэнтральную частку. У выніку большасць канспіратыўных кватэр была знішчана. Падпольшчыкі страцілі амаль усе склады зброі, харчу і г. д. Шмат пакінутых для падпольнай працы людзей загінулі ў час бамбёжак, або папалі ў лапы фашысцкіх катаў. Была парушана адпрацаваная сістэма сувязі паміж падпольшчыкамі. Аднаўляць

усё гэта, ствараць новыя падпольныя групы і арганізацыі прыходзілася ўжо ва ўмовах гітлераўскай акупацыі. Гэта была вельмі цяжкая справа.

Часта былі выпадкі, калі склад кіруючых падпольных органаў, у сувязі з імклівым наступленнем ворага, адступаў з Чырвонай Арміяй. Здаралася, што ледзь прыступіўшы да працы былі захоплены кіруючыя кадры камсамола. Так, напрыклад, адбылося з сакратаром Барысаўскага гаркома камсамола Р. Х. Крупкіным, сакратарамі райкомаў: Бярэзінскага А. М. Ільінскім, Парэчскага Ш. З. Альшанскім. Але і ў такіх складаных абставінах, пераадольваючы шматлікія цяжкасці, летам 1941 г. перайшлі на падпольную працу Гомельскі абком і гарком, 15 сельскіх райкомаў камсамола, а ў 9 раёнах па аднаму сакратару райкома камсамола [2, с. 8].

Пасля акупацыі ўсёй тэрыторыі Беларусі ЦК ЛКСМБ распачаў работу ў савецкім тыле па стварэнню школ для падрыхтоўкі камсамольскіх работнікаў, якія павінны былі потым узначальваць антыфашысцкае падполле у нямецкім тыле. Усяго ў тыле ворага, на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі працавалі: 10 падпольных абкомаў, 214 гаркомаў, межрайкомаў і райкомаў камсамола, а таксама 2500 першасных камсамольскіх арганізацый у партызанскіх фарміраваннях, амаль 3 тыс. падпольных камсамольскіх і 335 антыфашысцкіх арганізацый, аб'яднoўваўшых каля 80 тыс. камсамольцаў-партызан і 20 тыс. падпольшчыкаў [2, с. 12].

Вялікую ролю камсамольскае падполле адыграла ў ідэалагічнай барацьбе супраць германскіх захопнікаў. Так, падпольныя камсамольскія органы выдавалі ў тылу ворага 8 маладзёжных газет («Чырвоная змена», «Сталинская молодежь», «Молодой партизан», «Молодой мститель», «Молодежь в борьбе», «Молодежная правда», «Сталинградское племя», «Партизан-комсомолец»), улёткі, адозвы да моладзі.

Такім чынам, камсамольска-маладзёжнае падполле Беларусі ўнесла значны ўклад у агульную барацьбу беларускага народа за вызваленне Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

*Літаратура*

1. Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1995. Ч. 2.
2. Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1944). Мн., 1976.

## НАВЕЧНО В НАШЕЙ ПАМЯТИ...

***А. Н. Зыбенок, Т. А. Мальгина***

В мирную созидательную жизнь белорусского народа война ворвалась внезапно большим горем. В ранний предрассветный час 22 июня 1941 г. сотни германских самолетов с зажженными бортовыми огнями стремительно вторглись в воздушное пространство Советского Союза.

Так началось предательское нападение гитлеровской Германии на Советский Союз, началась Великая Отечественная война советского народа